# Сінтаксічны разбор словазлучэння

1. Выдзеліце словазлучэнне са сказа.

2. Вызначце будову словазлучэння: знайдзіце галоўнае і залежнае словы; укажыце, якімі часцінамі мовы яны выражаны; устанавіце від сінтаксічнай сувязі паміж галоўным і залежным словамі (дапасаванне, кіраванне, прымыканне).

3. Укажыце граматычнае значэнне словазлучэння (прадмет і яго прымета; дзеянне і прадмет; дзеянне і яго прымета; прымета і яе ступень).

# Сінтаксічны разбор простага сказа

1. Вызначыць, што сказ просты, выдзеліўшы яго граматычную аснову.

2. Разабраць сказ па членах сказа (спачатку вызначаюцца дзейнік і выказнік, затым дадзеныя члены, якія ўваходзяць у склад дзейніка, затым дадзеныя члены, што ўваходзяць у склад выказніка). Вызначыць, чым выражаны члены сказа.

3. Расказаць пра будову сказа:

а) двухсастаўны ці аднасастаўны; калі аднасастаўны – якога віду (пэўна-асабовы, няпэўна-асабовы, абагульнена-асабовы, безасабовы, назыўны);

б) развіты ці неразвіты;

в) поўны ці няпоўны (калі сказ няпоўны, указаць, які член сказа апушчаны);

4. Калі сказ ускладнены, адзначыць, чым ускладнены (аднароднымі членамі – якімі іменна; звароткамі; пабочнымі словамі, словазлучэннямі, сказамі, устаўнымі канструкцыямі; адасобленымі членамі сказа – якімі іменна; паразнальнымі канструкцыямі).

5. Назваць від сказа па мэце выказвання (апавядальны, пабуджальны, пытальны).

6. Назваць від сказа па эмацыянальнай афарбоўцы (па інтанацыі): клічны ці няклічны.

7. Даць поўную характарыстыку членам сказа: выказнік (просты дзеяслоўны, састаўны дзеяслоўны, састаўны іменны); дапаўненне (прамое ці ўскоснае); азначэнне (дапасаванае ці недапасаванае); акалічнасць (месца, часу, прычыны, мэты, умовы, спосабу дзеяння, меры і ступені, уступкі).

8. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.

# Сінтаксічны разбор складаназлучанага сказа

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, вызначыць граматычныя часткі складанага сказа і абазначыць іх лічбамі.

2. Вызначыць злучнікі (спалучальныя, супраціўныя, размеркавальныя), пры дапамозе якіх звязаны часткі складаназлучанага сказа.

3. Вызначыць сэнсавыя адносіны (адначасовасці, паслядоўнасці, супастаўлення, супрацьпастаўлення, чаргавання ці ўзаемавыключэння), якія выражаюцца паміж часткамі складаназлучанага сказа.

4. Пабудаваць схему сказа.

5. Растлумачыць знакі прыпынку.

6. Разабраць як просты сказ кожную граматычную частку.

## Сінтаксічны разбор складаназалежнага сказа

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, вызначыць граматычныя часткі складаназалежнага сказа і абазначыць іх лічбамі.

2. Вызначыць сродак сінтаксічнай сувязі паміж часткамі (падпарадкавальны злучнік або злучальнае слова).

3. Вызначыць, што паясняе даданая частка ў галоўнай (слова, словазлучэнне, усю галоўную частку).

4. Вызначыць сэнсавыя адносіны паміж граматычнымі часткамі (азначальныя, дапаўняльныя, акалічнасныя).

5. Вызначыць від даданай часткі: азначальная; дапаўняльная; акалічнасная (месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступальная, спосабу дзеяння, меры і ступені, параўнальная).

6. Пабудаваць схему сказа (гарызантальную або вертыкальную).

7. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.

8. Разабраць як просты сказ кожную граматычную частку.

## Сінтаксічны разбор складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі часткамі

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, вызначыць граматычныя часткі сказа і абазначыць іх лічбамі.

2. Вызначыць сродак сінтаксічнай сувязі паміж часткамі (падпарадкавальныя злучнікі, злучальныя словы).

3. Вызначыць, што паясняе кожная даданая частка ў галоўнай (або ў папярэдняй даданай) – слова, словазлучэнне, усю частку).

4. Вызначыць сэнсавыя адносіны паміж часткамі і від даданых частак.

5. Вызначыць від падпарадкавання даданых частак (сузалежнае аднароднае, сузалежнае неаднароднае, паслядоўнае, змешанае).

6. Пабудаваць схему сказа (гарызантальную або вертыкальную).

7. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.

8. Разабраць як просты сказ кожную граматычную частку.

## Сінтаксічны разбор бяззлучнікавага складанага сказа

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, вызначыць граматычныя часткі сказа і абазначыць іх лічбамі.

2. Назваць спосаб сувязі паміж граматычнымі часткамі.

3. Вызначыць сэнсавыя адносіны паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа (аднатыпныя часткі сказа: часавыя адносіны, супастаўляльныя, супрацьпастаўляльныя; разнатыпныя часткі сказа: прычынныя, выніковыя, умоўныя адносіны).

4. Пабудаваць схему сказа.

5. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа.

6. Разабраць як просты сказ кожную граматычную частку.

## Сінтаксічны разбор складанага сказа з рознымі відамі сувязі частак

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, вызначыць граматычныя часткі сказа і абазначыць іх лічбамі.

2. Вызначыць віды сувязі паміж граматычнымі часткамі: злучнікавая (злучальная, падпарадкавальная) ці бяззлучнікавая; злучльная і падпарадкавальная; бяззлучнікавая і злучальная; бяззлучнікавая і падпарадкавальная; бяззлучнікавая, злучальная і падпарадкавальная.

3. Вызначыць сэнсавыя часткі складанага сказа і сродак іх сінтаксічнай сувязі.

4. Пабудаваць схему сказа (гарызантальную або вертыкальную).

5. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай сэнсавай часткі.

6. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.

7. Разабраць як просты сказ кожную граматычную частку.